ББК 86
Мал 18

**Маліноўскі Яўген**

Парусія: псіхалогія прысутнасці. — Баранавічы : Грамадскае аб'яднанне "Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны", 2007. — 260 с., іл.

ББК 86

© Грамадскае аб'яднанне
"Таварыства беларускай мовы
імя Францішка Скарыны" 2007
© Афармленне Уладзімір Гундар

# Прыйсьці да сваёй веры

## Прадмова

Шаноўнае спадарства! Вы трымаеце ў руках кнігу баранавіцкага грэка-каталіцкага сьвятара айца Яўгена Маліноўскага "Парусія: псыхалёгія прысутнасьці". Артыкулы з гэтае кнігі пэўны час друкаваліся на старонках мясцовай газэты Intex-press і мелі вялікі водгук у грамадзтве. Сябры і прыхільнікі уніяцкай парафіі вырашылі сабраць ў адзінае цэлае, што напісанае настаяцелем баранавіцкага прыходу св. Кірылы і Мятода Беларускай Грэка-Каталіцкай Царквы, надрукаваць суцэльнай кнігай.

У мінулым стагоддзі ўніяцкі сьвятар Леў Гарошка, які ў гады Другой сусьветнай вайны кіраваў у Баранавічах медычнай школай, напісаў кнігу "Навука і рэлігія". Аўтар абвяргаў савецкія тэзісы аб шкоднасьці рэлігіі, нясумяшчальнасьці веры ў Бога і навукі, пераканаўча даказваў, што найбольшыя вучоныя ў аграмаднай большасьці былі веруючымі людзьмі. Традыцыі архімандрыта Льва Гарошкі жывуць і працягваюцца сёньняшнімі ягонымі пасьцежнікамі.

Кніга айца Яўгена Маліноўскага "Парусія: псыхалёгія прысутнасьці" – гэта першы вопыт псыхалягічнага абагульненьня рэлігійнай і палітычнай практыкі. Хацеў бы адзначыць, што гэтую тэму сучасныя навукоўцы і сьвятары дэлікатна абыходзяць, "пераканаўча" спасылаючыся, што сапраўдная рэлігія па-за палітыкай. Пэўна яно так і ёсьць у дэмакратычным грамадзтве, але не ў нас. Трэба прызнаць мужнасьць уніяцкага сьвятара, які ў сваіх развежаньнях пра Бога і існасьць спалучае рэлігію і палітыку, псыхалёгію і мастацтва. Праўда, айца Яўгена цікавіць не столькі сама палітыка, як правая свабода. І калі палітыка перашкаджае свабодзе, то трэба аб гэтам смела казаць. Але на такі крок сёньня здольны не кожны чалавек.

Беларуская дзяржава Вялікае княства Літоўскае было прававой дзяржавай, у якой панавала воля і талерантнасьць. Прыгонныя сяляне і стараверы сотнямі тысячаў беглі сюды з Расеі ад дэспатызму. Перасьледаваныя на радзіме ардынс-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

II.17. Выбары ........ 78
II.18. Палітыка ........ 81
II.19. Жэрабя кінута ........ 85
II.20. Пост ........ 88
II.21. Пасха ........ 91
II.22. Духоўнасць ........ 93
II.23. Хараство ........ 96
II.24. Быць ........ 99
II.25. Тройца ........ 102
II.26. Слава ........ 105
II.27. Храм ........ 108
II.28. Лішак ........ 111
II.29. "Не хочу иметь ребенка..." ........ 116
II. 30. Радаснае ганенне ........ 117
II.31. Вавілонская вежа тэлерэчаіснасці ........ 123
II.32. Час асабістай прысутнасці ........ 127
II.33. Выбранасць ........ 131
II.34. Ад сектанцтва да еднасці ........ 134

III
ЭКЗІСТЭНЦЫЯ ВЫХАВАННЯ ........ 137
III.1. Успенне ........ 138
III.2. Акмеалагічная перспектыва ўзросту ........ 142
III.3. Тэапсіхалагічная канфесійнасць асобы ........ 150
III.4. Сямейная трапеза экумены ........ 153
III.5. Прафесія маці ........ 156
III.6. Прафесія: айцец ........ 160
III.7. Сямейная парусія: "Сем хлябоў і дзве рыбы" ........ 164
III.8. Вяртанне да сябе ........ 169
III.9. Інтралог ........ 172
III.10. У сям'і не без нарцыса ........ 176
III.11. Любоў не раздражняецца ........ 180
III.12. Ружанец у псіхічным развіцці дзіцяці ........ 183
III.13. "Лебядзінае паляванне" ........ 188
III.14. Містыка ........ 189
III.15. Алтарна-педагагічныя разважанні ........ 192
III.16. Педагагічныя прынцыпы асабістай свабоды ........ 196

IV
ПЕДАГАГІЧНАЯ ПРАПАВЕДЗЬ ........ 203
IV.1. Псіхагістарычны сэнс Евангелля ........ 204
IV.2. Час казання ........ 206
IV.3. Вызваленне спаралізаванага ........ 208
IV.4. "Хай будуць усе адно" ........ 210
IV.5. Суд Божы ........ 215
IV.6. Цуд Божы ........ 218
IV.7. Навігацыя ........ 221
IV.8. Экзарцызм, альбо выгнанне дэманаў ........ 224
IV.9. Перамяненне Гасподняе ........ 226
IV.10. Pietas – Шанаванне ........ 228
IV.11. Не судзі ........ 230
IV.12. Багацце ад Бога ........ 232
IV.13. "Камень, адкінуты будаўнікамі" ........ 234
IV.14. Падвышэнне Пачэснага і Жыццядайнага Крыжа ........ 236
IV.15. Казанне на свята Андрэя Першапаклікага ........ 240
IV.16. Шлюбная вячэра ........ 243
IV.17. Старое віно і новая ахвяра ........ 245

POST-PARTOR* – СПАДКАЕМЦА ........ 249

ГЛАСАРЫЙ ........ 251

ЛІТАРАТУРА ........ 253

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

## IV.13. "Камень, адкінуты будаўнікамі"

Важнасць разумення прыпавесці аб вінаградары [Мц 21, 33; Мк 12; Лк 20] дзеля нашага збавення акрэслена свядомасцю кожнай хрысціянскай асобы. Выдатна тое, што яе змест адпавядае зместу кнігі прарока Ісаі: "І Ён, Улюбёны Мой, абнёс вінаграднік агароджаю і ачысціў яго ад камянёў, і пасадзіў ў ім адборныя вінаградныя лозы, і пабудаваў вежу сярод яго, і выкапаў у ім тачыла, і чакаў, што ён прынясе добрыя плады, а ён прынёс дзікія ягады" [Іс 5, 1-7].

Усе вобразы, ужытыя ў прытчы, запазычаны з рэчаіснасці і з прароцтва. Так было раней, дзе апрацоўваўся "вінаград", так адбываецца і цяпер. Жыццёвы вопыт выводзіць заканамернасць, па якой усякая добрая справа павінна аплачвацца злом, а калі не, то гэтая справа патрэбна не Богу, а людзям з іхнімі зямнымі марамі і мітуслівымі пажаданнямі. Пачатак і канец іх вядомы і відавочны. Але пачатак і канец Уладарства Нябеснага – Той, Хто, як некалі, так і цяпер, адвяргаецца родам людзей, ня дбаючых аб гэтым Уладарстве. Таму ўсялякі час Яго прыйсця суправаджаецца масавым "непаразуменнем і тугой народаў"[Лк 21, 25]. Калі чалавек з мэтай нажывы паступова і накіравана забівае ў сабе сваё сумленне, урэшце рэшт ён паўстае перад лёсам пачварнага забойства ў сабе самім Таго, Хто з'яўляецца асновай усякага сумлення і годнасці.

Так, "Камень, адкінуты будаўнікамі, той самы стаўся каменем кутнім, гэта сталася ад Госпада, і ў вачах нашых дзіва" [Пс 117, 22]. Што гэта за камень, нам дакладна вядома праз Святое Пісанне, у тым ліку, праз гэтую прыпавесць. Але як ён праяўляецца ў штодзённым нашым жыцці? Бо часта бывае так, што за мітуснёй мы не заўважаем, як самі паступова робімся неадчувальнымі, абыякавымі да нябачнага, але існага пастаянства, сталасці Уладарства ў нас саміх, якое будуецца на любові Божай. Таму сённяшні апостальскі зачын настаўляе нас: "Браты, усё ў вас няхай ў любові робіцца" [1 Кар 16, 14]. І далей апостал патрабуе ад вернікаў шанавання сем'яў, "якія аддалі сябе на служэнне святым". [1 Кар 16, 15], бо асновай такіх сем'яў з'яўляецца любоў Божая, камень, пачатак усякага поспеху і шчасця. "Хто не любіць Госпада Ісуса Хрыста – анафема! Маранафа!" [1 Кар 16, 22].



Вось у чым асноўны сэнс і камень Уладарства. Без гэтай асновы жыццё і вера чалавека робіцца бессэнсоўным. Таму кожны, хто жыве на прыкладзе старазапаветных будаўнікоў, хай разумее, што Хрыстос і ў гэты час творыць прыпавесць аб іх. Разумее, але нічога не можа зрабіць са сваёй злосцю на Ісуса, і таму вымушаны выкінуць Яго са свайго сэрца. Падчас тэлеперадачы вядомы расійскі акцёр Армен Джыгарханян катэгарычна заявіў: "Бога нет и всё!". Гэтым выказваннем у чарговы раз пацвердзілася праўдзівасць 13 Псальма: "Сказаў шаленец у сэрцы сваім: няма Бога". Чалавек [illegible]рабіў [illegible]ар, пасля такога здрадніцтва, ён належыць ужо не сабе, але таму іншаму "каменю", да якога прыхілілася ягоная душа, якая сама па сабе паступова робіцца мураванаю – жорсткай і абыякавай, якая канчаткова выраклася любові Божай.

У сваім пасланні да Карынцянаў ап. Павел піша: "Калі я маю прароцтва, і ведаю ўсе тайны і ўсякае веданне, і калі маю ўсю веру, каб і горы перастаўляць, а не маю любові, дык я нішто" [1 Кар. 13, 21]. І калі мы, браты і сёстры, верым ды молімся, але крыўдзім альбо крыўдзімся на блізкага свайго, дык ужо гэтым самым і адвяргаем праўдзівы "камень" свайго жыцця і сваёй веры, якая без любові Божай становіцца фарысейскай ды крывадушнай. Але дом, збудаваны на існым "камені", не будзе хістацца "падзелам у сабе самім" [Мр 3, 25], альбо "нечаканым павадкам" [Лк 6, 48].

Ня ўсе людзі абвяргаючыя існаванне Бога трымаюцца свайго пераканання да сконы сваіх дзён. Любоў Божая і ласка ўсёж трывае ў слове Божым і рана ці позна трапляе ў іхняе сэрца, так адбылося і з вядомым савецкім навукоўцам Лювом Выгоцкім. Так марксісцкі псіхолаг падчас камуністычнай навалы 30-х гадоў СССР вызнае Слова Божае вышэй за класавыя інтарэсы дысцыплінарнага "монстра". "Камень, презренный строителями, стал главою угла" ён смела выкарыстоўвае ў якасці эпіграфа сваёй метадалагічнай працы "Исторический смысл психологического кризиса", надрукаванай толькі праз 50 год пасля яе напісання. Заканчвае ён сваю перадсмяротную навуковую работу метафарай новай и старай псіхалогіі як сузор'я Пса ды сабакі, што брэша. Такое крэатыўнае стаўленне вызводзіць навуковую сістэму з метадалагічнай абыякавасці да Слова за кошт яго свабоды і тэалагічнай рэфлексіі ў псіхалагічнай культуры асобы.